будет пользоваться всегда выгодами». [9] Но открыто было отделение Госбанка в Гомеле только в 1909 г.

По существовавшей в то время классификации по Уставу банка местные учреждения делились на конторы и отделения постоянные (трех разрядов) и временные, и агенства. Конторы по банковскому Уставу могли располагаться только в крупных торгово-промышленных центрах. К 1914 году их насчитывалось только десять во всей Российской империи, а в Беларуси их не было. Отделения разных разрядов отличались по одному главному признаку - праву открывать собственной властью кредиты: отделения третьего разряда - до 10 тысяч рублей, отделения второго разряда - до 20 тысяч рублей, отделения первого разряда – до 30 тысяч рублей. [10] Кредиты, превышающие эти нормы, предоставлялись в каждом отдельном случае на утверждение Совета банка в Санкт-Петербурге. Действовавшие в губерниях Северо-Западного края отделения Госбанка относились в основном к низшим разрядам. Отделением первого разряда было только Виленское, статус второго разряда имели отделения в Минске, Гродно и Белостоке, третьего – Могилеве, Витебске, Двинске, Гомеле.

Таким образом, к 1884 году вся территория Северо-Западного края попала в сферу деятельности Государственного банка, что имело немаловажное значение для экономического развития, так как Госбанк обладал более широкими возможностями для кредитования крупной промышленности и сельского хозяйства. Имевшаяся к тому времени широкая сеть частных и общественных кредитно-банковских учреждений занималась в основном учетом векселей и предоставлением краткосрочных ссуд.

**СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ**


1. Государственный банк. Краткий очерк деятельности за 1880 – 1910 годы. Составлен под редакцией директора Государственного банка Е.Н.Сланского. – СПб.: Товарищество Р.Голике и А.Вильборг, 1910. – С.1.
2. Судейкин В. Государственный банк: Исследование его устройства. – СПб.: Типография В.Ф.Киршбаума , 1891. – С.275.
3. Национальный исторический архив Беларуси г.Минск (далее НИАБ). – ф.1430. – оп.1. – д.35419. – л.1.
4. Там же. – л.3.
5. Там же. – л.4.
6. Судейкин В. Указ. Соч. – С.275.
7. Там же.
8. Русские банки. Справочные и статистические сведения о всех действующих в России государственных, частных и общественных кредитных учреждениях. Составил А.К.Голубев. (год четвертый). – СПб.: Скоропечатня П.Я.Яблонского, 1908. – С.5.
9. НИАБ. – ф.2001. – оп.1. – д.1386. – л.1.
10. Банковская энциклопедия / Под общ.ред. проф. Л.Н.Яснопольского. Т.1.
11. Коммерченские банки. – Киев: Тип. 2-й Артели, 1914. – С.340.


УДК 930.2 (476.7)

***Гладышчук А.А.***

# ЦАГЛЯНАЯ КАЛОНА Ў АКОЛІЦАХ СКОКАЎ (БРЭСЦКІ РАЙОН) – ВЫДАТНЫ ПОМНІК ЭПОХІ АСВЕТНІЦТВА

Цагляная калона [1], што стаіць на прыкметным узвышшы паміж вёскамі Скокі і Матыкалы ў аколіцах Брэста і аб якой пойдзе гаворка ў артыкуле, даўно інтрыгавала людзей дапытлівых. Таму і аўтар, які жыве ў Скоках, мае цалкам зразумелую цікавасць да гэтай гістарычнай спадчыны. Першую спробу адказаць на пытанне, для чаго ўзведзенна цагляная калона каля Скокаў, зрабіў у сваім артыкуле вядомы брэсцкі журналіст, які піша на гістарычныя тэмы, Юрась Рубашэўскі [2]. Яго меркаванне: цагляную калону маглі ўзвесці ў гонар Канстытуцыі 1791 года федэратыўнай дзяржавы Рэчы Паспалітай, да якой меў прамое дачыненне наш знакаміты зямляк Юльян Урсын Нямцэвіч. Свая лагічнасць у такім меркаванні безумоўна ёсць, але аўтар не прыводзіць пісьмовых крыніц, якія маглі б гэтую думку абгрунтаваць. Да таго ж Канстытуцыя 1791 года дзейнічала зусім нядоўга, таму што Рэч Паспалітая, як дзяржава, будучы канчаткова падзеленая Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй, перастала існаваць. Ды і "свежы" Канстытуцыйны слуп не мог не пярэчыць палітыцы Расіі і меў малы шанс устаяць. Гэтыя разважанні наводзяць на думку, што цагляная калона была ўзведзена значна раней і з іншай нагоды.

Дык вось, мясціна, аб якой ідзе гаворка, у мясцовых жыхароў мае сваё гістарычна ўстойлівае імя **«Рахвал»**, якое моцна б’е па слыху і якое першы раз аўтар пачуў ад дырэктара мясцовай школы Валянціны Саевец (дарэчы, яна карэнная жыхарка гэтых мясцін ). Аднак ніхто не мог растлумачыць сэнс гэтай рэдкай назвы мясцовасці, а пошукі ў літаратурных крыніцах не мелі поспеху. Другое сумненне, што з гэтай назвай мясцовасці не так усё проста, закінуў сціплы, памяркоўны мясцовы жыхар, які калісьці вучыўся ў прыватнай гімназіі імя Ю.Нямцэвіча ў Брэсце, Марк Маркавіч Мартынюк, з якім мы чакалі прыезду да Скокаў нашчадкаў Нямцэвічаў у маі гэтага года. Мой субяседнік заўважыў, што са слоў яго бабулі, калоне той “на Рахвале” ад вайны з Напалеонам да яе часу (перад другой сусветнай вайной) столькі ж гадоў, як і назад адкруціць, а можа і больш таго. Сціплая фраза прынцыпова мяняла напрамак пошукаў.

Вядомы краязнаўца Л.М.Несцярчук у сваёй грунтоўнай працы "Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X-XX стагодзяў" [3], якая пабачыла свет у гэтым годзе, назваў цагляную калону старадаўнім помнікам-вежай XVIII стагоддзя, але не ўдакладніў яе гістарычнае прызначэнне.

У гэтым годзе ў Брэсце праходзіла навуковая канферэнцыя, прысвечаная нашаму земляку, вядомаму пісьменніку і публіцысту, гісторыку, ад'ютанту і сакратару Тадэвуша Касцюшкі Юльяну Урсын Нямцэвічу. Дыскусіі выявілі, што ёсць яшчэ нямала "белых плямаў" адносна жыцця і дзейнасці гэтага славутага чалавека. Гэта ў прыватнасці датычыцца і да канкрэтнага месца, дзе мог стаяць драўляны дом, у якім нарадзіўся Ю.У.Нямцэвіч. Знакаміты даследчык гістарычных паркаў і палацаў Беларусі А.М.Кулагін у сваёй працы [4], прывёўшы дэталёвае апісанне таго старога будынку з успамінаў Юльяна У.Нямцэвіча, нечакана робіць выснову, што на месцы разабранага каля 1770 г. сціплага шляхецкага дома бацька Юльяна ўзвёў мураваны палац у Скоках.

Пад Брэстам Нямцэвічы, якія вядуць сваю радаслоўную з XV стагоддзя, аб’явіліся ў другой палове XVII стагоддзя: віцебскі стольнік (спачатку прыдворны чын, а затым ганаровае званне) Андрэй Нямцэвіч становіцца ўладальнікам вёсак Нэплі, што на Заходнім Бузе, і Клейнікі на рацэ Лясной – прытоку Буга. Яго сын Аляксандр, мечнік Берасцейскага ваяводства, далучыў да гэтых вёсак Скокі, якія і дасталіся ў



***Гладыщук Анатолий Антонович.*** *К. ф.-м.н., зав. каф. физики Брестского государственного технического университета. Беларусь, БГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*

спадчыну Марцэлю, бацьку нашага знакамітага земляка Юльяна Урсын Нямцэвіча (16.02.1758, Скокі – 21.05.1841, Парыж).



Здымак 1 – Фрагмент трохстворкавага складзеня з вобразам архангела Рафаіла. Тураў. Усесвяцкая царква, 1760 г. Беларуская школа.

У згаданай ужо канферэнцыі ў Брэсце прымалі ўдзел нашчадкі Нямцэвічаў. У іх ліку была прыехаўшая з Францыі Тэрэса Вярыха з Урсын Нямцевічаў, якая нарадзілася ў Скокаўскім палацу ў 1925 годзе. Яна прывезла с сабой на кампутарнай дыскетцы ўспаміны свайго бацькі Станіслава Урсын Нямцэвіча, апошняга ўладара з Нямцэвічаў Скокаўскім маёнткам, які пакінуў Скокі задоўга да падзей 1939 года і падаўся да Францыі. Гэта дае магчымасць меркаваць, што захаваныя фамільныя паперы ён мог забраць без усялякай перашкоды, а там значацца тэстамэнты як Марцэля У.Н. (бацькі Юльяна) ад 1796 года, так і дзеда Юльяна Аляксандра ад 1763 года. Як піша ў сваіх успамінах "Маім унукам" Станіслаў У.Нямцэвіч [5]: "Марцэль, падчашы Мельніцкі, быў для свайго часу выдатным асвечаным шляхціцам, меў вялікі інтарэс да спраў дзяржавы і гісторыі краю. Вёў пошукі ў старых архівах і нават перапісваў гісторыю свайго ваяводства". Дарэчы, Юльян, яго старэйшы сын, пазней напіша, што сваёй цікавасцю да гісторыі і спраў дзяржаўных, якія праявіліся яшчэ ў дзяцінстве, ён абавязаны бацьку.

Дык вось на пятай старонцы ўспамінаў Станіслава У.Нямцэвіча [5], якія датычаць бацькі Юльяна – Марцэля, ёсць такі тэкст (прыводзім яго даслоўна на польскай мове): *"…Odziedziczywszy po ojcu znaczne dobra, a w tym i Skoki, z biegiem czasu znacznie owe dobra pomnożył. On to zbudował około 1770 roku pałac skokowski i dokończył kościół w 1796 roky. Odziedziczony po ojcu dworek modrzewiowy skokowski, w którym urodził się Julian, stał w innym zupełnie miejscu, niedaleko obecnego toru kolejowego, przy gościńcu do gminy Motykały, dotykał też do starego dębowego lasu. Creść tego ostatniego przerobił Marceli na rodzaj parku; wzdłuż gościńca ustawił liczne, naturalnej wielkości drewniane figury "światków", które nocą straszyły konie podróżnych. Stąd liczne procesy z tymi ostatnimi, które słono kosztowały.* ***On też postawił na wysokim słupie posąg św. Rafała, który stał niedaleko dworku i z którego słup pozostał bez posągu do czasów ostatnich…"***

У перакладзе гэты тэкст гучыць так: **"Атрымаўшы ў спадчыну ад бацькі значнае багацце, у тым ліку і Скокі, на працягу некаторага часу шматразова яго прымножыў. Гэта ён** [Марцэль Урсын Нямцэвіч, аўт.] **пабудаваў каля 1770 года Скокаўскі палац і завершыў будаўніцтва касцёла ў 1796 годзе. Атрыманы ў спадчыну ад бацькі скокаўскі дворык з лістоўніцы, у якім нарадзіўся Юльян, знаходзіўся зусім у другім месцы, непадалёку ад існуючай цяпер чыгункі, каля гасцінца, што вядзе да гміны Матыкалы, і прымыкаў таксама да старога дубовага лесу. Частку таго апошняга Марцэль перарабіў по тыпу парку; уздоўж гасцінца ўстанавіў шматлікія, натуральнай велічыні драўляныя фігуры "святкаў", якія ноччу палохалі падарожнікаў. Адгэтуль шматлікія цяжбы с тымі апошнімі, якія каштавалі слана. Ён таксама паставіў на высокай калоне статую святога Рафала, якая стаяла непадалёку ад дворыка і ад якой да апошняга часу засталася калона без статуі…"**

Пасля гэтай звесткі губляе сэнс змест афіцыйнай шыльды на запушчанным палацу ў Скоках: «Здесь 16 февраля 1758 года родился польский писатель Юлиан Немцевич». Безумоўна, гэта ні ў якім разе не павінна адбіцца на гістарычнай каштоўнасці ацалеўшага палаца XVIII стагоддзя, адзінага падобнага ў аколіцах Брэста і навогул у самім Брэсце – горадзе, маючым тысячагадовую гісторыю. Гэты палац павінен быць удзячны мясцовай школе, якая доўгі час там знаходзілася. Сёння сціплы палац пакутліва чакае свайго новага гаспадара.

Адсюль вынікае наступнае пытанне: а дзе ж стаяў той бацькоўскі невялікі дворык? Ёсць і напрамак пошукаў: стары гасцінец да Матыкалаў, адбіткі якога яшчэ праглядваюцца на мясцовасці. Кожны, хто бываў у ваколіцах Скокаў, не мог не заўважыць на ўзвышшы паміж Скокамі і Матыкаламі, адкуль ў ясны дзень адкрываецца агульная панарама нашага сучаснага Брэста, прыкметную цагляную калону вышынёй метраў каля сямі. Два гады таму назад яна была адрамантавана мясцовай уладай. У народзе існуюць розные меркаванні наконт яе паходжаня, але мясціна, дзе яна стаіць, не выклікае сумненняў - гэта Рахвал.

Той, хто вырас у нашых мясцінах, добра ведае, што ў мясцовых дыялектах, гук "Ф" часта вымаўляюць як "Хв", адсюль не Рафал, а Рахвал. Такім чынам, круг замкнуўся: цагляная

калона, на якую Марцэль узнёс святога Рафала каля 250 гадоў назад, дала гістарычную назву мясцовасці, і яна,гэтая калона, захавалася да сёняшнега часу.

Звернемся яшчэ раз да ўспамінаў, дзе Станіслаў У.Нямцэвіч зусім у другім месцы на старонцы трыццаць восьмай свайго рукапісу [5] паўторна робіць важнае ўдакананенне: **"…Непадалёку ад дворыка стаяла цагляная калона з фігурай святога Рафала. Калона тая без фігуры захавалася да апошняга часу…"**

Менавіта тут, непадалёку ад калоны Рафалу, якая нейкім цудам ацалела да нашага часу, у даўно змянённай мясцовасці ў сціплым будынку нарадзіўся і вырас Юльян Урсын Нямцэвіч, а сведцы гэтаму, які добра памятае Юльяна, прыкладна 250 гадоў. Узрост паважны (здымак 2).



Здымак 2 – Цагляная калона Рафаілу каля Скокаў і месца, дзе стаяў драўляны дом Нямцевічаў.

Што дапамагло гэтай калоне ў гістарычнай кругаверці выстаяць, сказаць цяжка, але скідываць з разліку яе «святасць» не будзем. Хто ж такі Рахвал ці дакладней Рафаіл? У суствутнай паслябіблейскай міфалогіі [6] гэта адзін з сямі вялікіх анёлаў-архангелаў. Апокрыфічная кніга Еноха прызнае яго другім пасля Міхаіла. У некананічнай кнізе Товіта ён выступае ў ролі анёла-цэліцеля, якога паслаў Бог, кабы вярнуць Товіту зрок і пазбавіць ад злых духаў. Разам з гэтым Рафаіл (здымак 1) выступае нараўне з другімі архангеламі ў функцыі асветніка і вучыць Ноя распазнаваць лекавые травы, перадае Адаму кнігі тайных ведаў, а ў «Загубленым раю» Дж.Мільтона ён прадстае настаўнікам Адама і Евы. Што тут разважаць: Марцэль добра ведаў, каго ўзнесці на высокую цагляную калону, а сродкаў на гэтыя справы ён не шкадаваў. Да таго ж дакладны пераклад імя Рафаіла з яўрэйскай мовы гучыць як «Ісцэлі, Божа!». А сям'я ў Марцеля была шматдзетнай: ягоная жонка Ядвіга з Сухадольскіх нарадзіла ні больш ні менш як пятнаццаць дзяцей і толькі палова з іх не памёрла ў дзіцячым узросце. Таму і зварот Марцеля да архангела Рафаіла добра зразумелы.

І заключны акорд гучыць ад самога Юльяна Урсын Нямцевіча. Як напісаў ён у першым томе сваіх "Дзеннікаў часоў маіх" на старонцы трыццаць пятай, дзе прыводзіць дэталёвае апісанне таго бацькаўскага драўляннага дома, у якім ён сам нарадзіўся і вырас [7]: **"W innym miejscu postawił mój ojciec pałac murowany"**— пераклад не патрабуецца, усё зразумела. Такім чынам высвятляецца, што пад Брэстам існуе цікавы гістарычны аб'ект, да якога з павагай усім нам трэба паставіцца. І так многа чаго змарнавалі.

**СПІС ВЫКАРАСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ**


1. Гладышчук А.А. Рахвал-збавіцель. Брэст, Вечерний Брест, № 82, 2002.
2. Рубашевский Ю.С.Кто поставил столп? Брест, Вечерний Брест, сент.,1997.
3. Несцярчук Л.М. Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X-XX стагоддзяў. Мн, "Белта", 2002, С.54.
4. Кулагін А. Сядзіба Скокі. Юльян Урсын Нямцэвіч. Мн, Роднае слова. № 12, 2000, С.86-90.
5. Niemcewicz S.U. Moim wnukom. Manuskrypt, 1975, s.44.
6. Мифы народов мира. Т. 2, М., Советская энциклопедия, 1982, С.371.
7. Niemcewicz J.U.Pamiętniki czasów moich.T.1,Warszawa, Państwowy Instytut Wydawniczy,1957, S.35.


УДК 159.9

***Трифонюк А.Ф.***

# ПСИХОЛОГИЧЕСКИЕ ОСОБЕННОСТИ ФОРМИРОВАНИЯ ГРАММАТИЧЕСКИХ НАВЫКОВ УСТНОЙ РЕЧИ В УСЛОВИЯХ УЧЕБНОГО ОБЩЕНИЯ

Студенты экономического факультета университета свободно пользуются грамматическими средствами английского языка в стандартных ситуациях на занятии (фонетическая зарядка, сообщение домашнего задания, диалог на экономическую тематику, вопросы по тексту), но часто допускают грамматические ошибки, запаздывают с речевой реакцией или переходят на русский язык, когда возникают нестандартные ситуации и новые коммуникативные задачи.

Слабое владение грамматикой часто является причиной, которая мешает студентам полноценно, творчески общаться на английском языке.

В данной статье я хочу поделиться опытом формирования грамматических навыков студентов группы Ма-13 экономического факультета в условиях учебного англоязычного общения на примере обучения вопросительным высказываниям.

Традиционно грамматические навыки устной речи у студентов формируются изолированно, вне деятельности речевого общения, в которой они должны функционировать. Навыки вырабатываются в процессе выполнения упражнений, которые носят формальный характер и не имеют достаточной коммуникативной направленности. Например: Supply the articles where necessary, Supply the correct forms of the verbs, Supply the prepositions where necessary, Say what you have learned about …; Summarize the letter. Как показывает анализ учебников английского языка для делового общения под редакцией Дудкиной Г.А., коммуникативные упражнения составляют примерно четвертую часть от общего количества упражнений.

Как приблизить условия учебной деятельности студентов экономического факультета по выработке грамматических навыков к естественным условиям англоязычной коммуникации?

***Трифонюк Анатолий Фомич.*** *Кандидат психологических наук, старший преподаватель каф. иностранных языков Брестского государственного технического университета.*
*Беларусь, БГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*